

**Бадзёрая радыёгімнастыка**

СТАР. 5



**Бяжыць уся сталіца**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЖНІЎНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 164 (28274)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# На шчасце!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Каваль сядзібна-паркавага турыстычнага комплексу «Дукорскі маёнтак» Пятро СМАЛЯКОЎ за работай. Выкаваныя падковы ён дорыць наведвальнікам маёнтка на шчасце.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Давід РОТМАН, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ:**

*«Дэпутатам павінен быць чалавек, які будзе часта сустракацца са сваімі выбаршчыкамі, каб даведацца, што ім трэба, чаго яны хочуць. Апытанні паказваюць, што людзям часам не хапае зносін з прадстаўніком заканадаўчай улады, за якога яны прагаласавалі. Акрамя таго, выбаршчыкі ў Беларусі хацелі б бачыць у парламенце патрыётаў і гаспадароў свайго слова. Дэпутат, на думку электарата, павінен валодаць дастатковым узроўнем адукаванасці, арганізаванасці і прафесіяналізму, каб умець вырашаць праблемы акругі і дамагацца выканання таго, што ён паабяцаў».*

# Хоцімск — горад хлебны

### У раёне распрацоўваюць канцэпцыю хлебнага фестывалю ў народных традыцыях

**На Магілёўшчыне кожны райцэнтр нешта сімвалізуе сабой. Слаўгарад — сыр, Шклоў — агуркі, Дрыбін — валёнкі. Хоцімск таксама можа неўзабаве займець свой брэнд. Тут усур'ёз падумваюць пра тое, каб аддаць павагу хлебу. «Наведаць Хоцімск і не паспытаць тутэйшага хлеба — усё роўна што наогул не пабываць у нас», — запэўнівае старшыня райвыканкама Сяргей ДЗЕМІДЗЕНКА. Акрамя таго, што мясцовае райпа робіць паважаны ўсімі прадукт амаль без дабавак, дык яшчэ мясцовае насельніцтва выпякае свой, па старадаўніх рэцэптах. Спецыялісты раённага Цэнтра культуры нават кніжку зрабілі, каб на святах і фестывалях рэкламаваць хоцімскія традыцыі хлебапячэння. А заадно праслаўляць хлебаробаў і пекараў. Сёння гэты прадукт каштуе капейкі, а колькі працы ў яго ўкладзена, мала хто задумваецца.**

## Які араты, такі і хлеб

Тое, што летась у Магілёўскай вобласці адрадзілі конкурс аратага, у раёне лічаць добрым знакам. Ад якасці працы механізатара, які сумяшчае ў сабе абавязкі і трактарыста, і камбайнера, залежыць і канчатковы вынік — будзем з хлебам або без.



Ганна СНЫТКО: наш хлеб з душой.

— Конкурс аратага вельмі неабходны. Гэта своеасаблівы экзамен на веданне сваёй справы. У навучальных установах такому не вучаць. Уменне прыходзіць толькі з вопытам, калі чалавек пачынае адчуваць плуг, ведае, як яго рэгуляваць, — падкрэслівае значнасць гэтага мерапрыемства **галоўны інжынер упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Хоцімскага райвыканкама Рыгор ШУРКОЎ.**

СТАР. 3

■ Акцэнт на здароўе

# РАСПЛАТА ЗА ЗВЫЧКІ

### Абсалютная большасць беларусаў прызнае здароўе адной з галоўных каштоўнасцяў. Прызнае... І толькі?

**У краіне рэалізуецца дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016—2020 гады. Да дзеяння яе прыцягнута велізарная колькасць службаў і ведамстваў, хоць значная роля ў любым выпадку належыць ахове здароўя. Што зроблена і плануецца зрабіць для павелічэння нараджальнасці, зніжэння смяротнасці, паляпшэння якасці жыцця? І самае важнае: што кожны з нас плануе зрабіць для гэтага?**

## РАДЗІЛЬНЯ З КАМФОРТАМ

У межах дзяржпраграмы плануецца паэтапнае пераасначашэнне радзільняў, у першую чаргу рэанімацыйных блокаў. Самай сучаснай, разлічанай на 5 тысяч родаў у год, з'яўляецца нядаўна адкрытая радзільня сталічнай 5-й бальніцы. Установа аснашчана самым лепшым абсталяваннем, з'явіліся там і два аддзяленні рэанімацыі для нованароджаных і парадзіх.

У верасні ў 6-й гарадской бальніцы адкрываюцца камфартабельныя радзільныя залы, перадродавыя і пасляродавыя палаты. Камфортная палата ў сучаснай радзільні — гэта велізарны пакой (тут і кухня, і тэлевізар), а галоўнае — свабодны пропуск сваякоў, якія могуць дапамагаць маладой маме і нават застацца пераначаваць. Прадастаўлена будзе і паслуга асабістага доктара, акушэркі — усё гэта напрамкі развіцця платных паслуг.

На базе гарадской гінекалагічнай бальніцы пачаў летась працаваць цэнтр эндаметрыёзу. Захворванне досыць распаўсюджанае, і небяспечнае пагрозай бясплоднасці. Дарэчы, на лячэння мужчынскай і жаночай бясплоднасці сёння прымяняецца шэраг эфектыўных метадаў. Дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі (у Мінску выкарыстоўваюцца ў РНПЦ «Маці і дзіця», гарадскім радзільным доме №2 і двух прыватных цэнтрах) зрабілі магчымым з'яўленне на свет 600 дзяцей (па краіне — каля тысячы).

СТАР. 4

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9571 | ▲ |
| Еўра | 2,2068 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0770 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПРАЦАВАЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

## Прэзідэнт у кастрычніку плануе зрабіць візіт у Пакістан

**У ходзе візіту Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з прэм'ер-міністрам гэтай краіны Навазам Шарыфам. Аб гэтым ішла размова на сустрэчы беларускага лідара з дзяржаўным міністрам па замежных справах, спецыяльным памочнікам прэм'ер-міністра Пакістана Саідам Тарыкам Фатэмі.**

«У нас няма ніякіх асабістых рознагалоссяў. Пры абмеркаванні многіх пытанняў — палітычных, эканамічных — у нас таксама поўнае супадзенне пунктаў гледжання. Мы заклалі зім фундамент на будучыню адносін паміж Пакістанам і Беларуссю», — адзначыў Прэзідэнт, гаворачы пра стасункі з прэм'ер-міністрам Пакістана.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі ганарацца дружалюбнымі адносінамі з такой магутнай і ўплывовай дзяржавай, як Пакістан, адзначыўшы, што маючая адбыцца сустрэча павінна быць глыбокай, на ёй плануецца прапрацаваць многія пытанні, у тым ліку на перспектыву.

«Мы хацелі б, і Наваз мне пра гэта казаў, каб пад нашы палітычныя, асабістыя адносіны была падведзена магутная гандлёва-эканамічная база. Мы ўзаемадапаўняльныя дзяржавы. Трэба наладзіць гэты мост эканамічнага супрацоўніцтва. І гэта галоўнае на перспектыву», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на неабходнасць абмеркаваць адносіны Пакістана і Беларусі з трэцімі краінамі. «Напрыклад, з КНР у вас бліскучыя адносіны і ў нас. З Расіяй. У вас з імі добрыя адносіны, у нас нагогул выдатныя. Тут таксама можна атрымаць вялікія выгады і прынесці карысць гэтым дзяржавам у тым ліку», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Саід Тарык Фатэмі вельмі цёпла вітаў Прэзідэнта Беларусі. Дыялог вёўся на рускай мове без дапамогі перакладчыка, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Ваш візіт будзе важнай гістарычнай падзеяй у нашых адносінах. Мы ўпэўнены, што ён дапаможа вывесці іх на яшчэ больш высокі ўзровень», — сказаў ён.

■ Дзяржаўны інтарэс

# НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ — ЗАНЯТАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА

**На пасяджэнні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканання бюджэту вобласці ў першым паўгоддзі 2016 года. У пасяджэнні прымаў удзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

На самым пачатку работы **кіраўнік вобласці Анатоль ЛІС** настроіў усіх выступоўцаў засяродзіцца на праблемах і шляхах іх вырашэння. Было адзначана, што за першае паўгоддзе ў поўным аб'ёме выкананы тры з васьмі ключавых паказчыкаў эфектыўнасці, зацверджаных рашэннем аблвыканкама летась. Не ўдалося выканаць ключавыя паказчыкі па валавым рэгіянальнаму прадукце, прадукцыйнасці працы, экспарце тавараў і паслуг, прамых замежных інвестыцыях.

Вострая размова адбылася, напрыклад, у кантэксце экспарту тавараў. Калі агульныя лічбы выглядаюць быццам бы нядрэнна (вобласць пастаўляе тавары ў 76 краін свету), то пры дэталёвым разглядзе выяўляюцца значныя хібы ў экспартнай палітыцы. Так, напрыклад, у краіны Афрыкі за паўгода прадалі прадукцыі на 21,8 тысячы долараў. Тлумачэнне намесніка старшыні аблвыканкама Міхаіла Сяркова, што малыя аб'ёмы абумоўлены першымі крокамі ў асваенні новых рынкаў, палічылі недастатковым пераканаўчым.

Сур'ёзную крытыку атрымаў і куратар будаўнічай галіны, намеснік старшыні аблвыканкама Віктар Сакоўскі. Будаўнічыя работы ў рэгіёне скарачаліся на чвэрць. Сёння стаіць задача захаваць калектывы, для гэтага трэба шукаць заказы ў блізкім і далёкім замежжы. Работа вядзецца, але выяўляюцца і зусім недапушчальныя факты. Будтрэст №8 не можа выканаць работы ў Туркменістане, згодна з дамоўленасцю, праз міжведамасныя нестыкоўкі. У выніку рабочыя не едуць на аб'ект, а тыя, што паехалі, сядзяць без работы.

У аграрнай галіне зноў на першы план выходзяць пытанні захавання тэхналогій і парадку на вытворчасці.

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч указаў, што ў справе паляпшэння экспартнай палітыкі трэба больш шукаць і праяўляць кемлівасць. Экспартная база рэгіёна не памянялася, значыць, варта трымацца за ранейшыя рынкі збыту і шукаць новыя. Сярод прыярытэтных напрамкаў спікер верхняй палаты парламента вылучыў занятасць насельніцтва. Гэта адна з самых галоўных праблем дня. Калі прадпрыемствы і ўстановы рэгіёна ў працэсе рэарганізацыі за апошні час паменшылі штаты прыкладна на 12 тысяч чалавек, то ўладкавана на новыя месцы 1700 чалавек. Гэта вельмі мала. Адным са шляхоў вырашэння праблемы занятасці павінна стаць павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і зніжэнне колькасці стратных прадпрыемстваў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# СУСТРЭЧА БЕЗ ГАЛЬШТУКАЎ

**Прэзідэнт Беларусі правёў нефармальную сустрэчу з вядомым амерыканскім акцёрам Стывенам Сігалам.**

Акцёр супрацоўнічае з беларускай IT-кампаніяй, аднак асабліва дзелавым гэты візіт не стаў. Пазнаёміўся з Аляксандрам Лукашэнкам Стывен Сігал, па яго ўласным прызнанні, марыў даўно і, збіраючыся ў Мінск, настойліва прасіў пра сустрэчу. Да Беларусі стаўленне ў госця асаблівае яшчэ і таму, што, як высветлілася, ёсць яго карані і ў нашай краіне.

Сустрэча з Прэзідэнтам атрымалася жывой і для госця вельмі пазнавальнай, з акцэнтам на сельскую гаспадарку, паведамляе БЕЛТА. Пытанне сапраўды актуальнае, паколькі ўборачная ў краіне ў самым разгары. Стывену Сігалу паказалі тое, без чаго не абыходзіцца ніводная беларуская гаспадарка, найбольш папулярныя культуры — буракі, капусту, морку. Тут жа ў полі адбылася і першая дэгустацыя.

За лёгкай вячэрай у рэзідэнцыі Прэзідэнта стравы беларускай кухні госці каштавалі літаральна «з градкі». Даспадобы прыйшліся халаднік, бульба і, вядома, беларускае сала. Натуральныя беларускія прадукты не пакінулі абыякавымі амерыканскіх гасцей.

# Ад гульнявой залежнасці выратуе суд

**Прэзідэнт падпісаў указ, які ўносіць змяненні і дапаўненні ў асобныя ўказы па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці і падаткаабкладання ў мэтах прывядзення іх у адпаведнасць з апошнімі зменамі Падатковага кодэкса, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Дакумент таксама скарэкціраваў Палажэнне аб ажыццяўленні дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу на тэрыторыі Беларусі, якое было зацверджана ўказам № 9 ад 10 студзеня 2005 года, у частцы прадастаўлення сваякам магчымасці звяртацца ў суд з заявай аб абмежаванні фізічнай асобы ў наведванні ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў. Гэтае нованўведзенне абумоўлена тым, што многія ўдзельнікі азартных гульняў, маючы гульнявую залежнасць, не могуць прымусіць сябе не наведваць такія ўстановы, што вядзе да цяжкага матэрыяльнага становішча іх блізкіх і разбурэння найважнейшага сацыяльнага інстытута дзяржавы — сям'і.

# ЧАКАЕМ ВІЦЕБШЧЫНУ

**Беларускія аграрыі ўбралі больш за 94% пасяўных плошчаў і ўжо блізкія да завяршэння ўборачнай кампаніі. Па аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча, на 25 жніўня сабрана 6765,2 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 33,6 ц/га. Як нядаўна адзначаў падчас прэс-канферэнцыі намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН, сёлета ўборачная кампанія зацягваецца з-за неспрыяльных умоў надвор'я.**

Першымі збор збожжавых і зернебабовых культур завяршылі гаспадаркі Брэсцкай вобласці з вынікам ў 1167,3 тысячы тон. Найбольшая ўраджайнасць атрымалася ў аграрыяў Гродзеншчыны — 37,1 ц/га, а найбольшы ўраджай у Міншчыны — 1741,2 тысячы тон. Больш за ўсіх збожжа засталося наўбраным у Віцебскай вобласці, дзе аграрыям яшчэ трэба будзе папрацаваць на чвэрці пасяўных плошчаў.




**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Досвед

# РЭАЛІЗАЦЫЯ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА



## Як праходзяць датэрміновыя выбары за мяжой

**У беларускай выбарчай практыцы актыўна выкарыстоўваецца датэрміновае галасаванне. Так, на парламенцкіх выбарах гэтага года можна будзе датэрмінова прагаласаваць з 6 па 10 верасня. Зразумела, чаму такая практыка выкарыстоўваецца — на выбарах важны голас кожнага грамадзяніна, а далёка не ўсе могуць прыйсці прагаласаваць на працягу аднаго дня. Прычыны могуць быць самыя розныя — ад ад'езду за мяжу на адпачынак або ў камандзіроўку да планавай аперацыі, але грамадзянін павінен мець магчымасць рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права. Наколькі распаўсюджана падобная практыка ў іншых краінах?**

Найбольш часта ў якасці прыкладу выкарыстоўваюць **амерыканскі вопыт**. Ён дастаткова разнастайны ў залежнасці ад штата. У некаторых штатах для выкарыстання такой формы галасавання патрэбна ўважлівая прычына, але заканадаўства 32 штатаў і акругі Калумбія дапускае асабістае датэрміновае галасаванне без абгрунтавання прычын выбару гэтай формы волевыяўлення. У некаторых штатах датэрміновая галасаваць па пошце, у некаторых датэрмінова выбаршчыкаў, у цэлым па краіне такой формай галасавання карыстаецца больш як трацiна тых, хто мае права голасу.

Працягласць датэрміновага галасавання таксама залежыць ад заканадаўства кожнага штата, што ўносіць хаос у падлік галасоў. Акрамя гэтага, на выбарах у ЗША выкарыстоўваецца яшчэ такая цікавая форма, як умоўныя бюлетэні. Імі выбаршчыкі могуць скарыстацца, калі не маюць пры сабе належнага пасведчання асобы пры галасаванні, своечасова не змянілі свае рэгістрацыйныя звесткі пасля пераезду або змены прозвішча, прыйшлі галасаваць не на свой участак або іх права голасу кімсьці аспрэчваецца. Такімі бюлетэнямі карыстаюцца мільёны выбаршчыкаў, але толькі дзве трацiны з іх потым пацвярджаюць у якасці сапраўдных, што выклікае цяжкасці падчас падліку вынікаў выбараў у выпадку, калі ў кандыдатаў прыкладна роўная колькасць выбаршчыкаў, якія аддалі ім галасы.

**У Канадзе** таксама актыўна выкарыстоўваецца датэрміновае галасаванне. Яно па заканадаўстве праводзіцца на працягу трох дзён. Пры тым, што насельніцтва краіны адносна невялікае ў параўнанні з ЗША, такая форма галасавання грамадзянам цікавая, і ёю рэгулярна карыстаюцца мільёны канадскіх выбаршчыкаў. У датэрміновым галасаванні маюць права прыняць удзел тыя, хто з розных прычын не зможа прыйсці на ўчастак ў дзень выбараў, а таксама вайскоўцы, раскватараваныя за межамі краіны. Выбаршчыкі могуць галасаваць і пры дапамозе бюлетэняў, якія адпраўлены па пошце.

Цікавы **расійскі досвед** датэрміновага галасавання. Як вядома, сёлета расійскія парламенцкія выбары пройдуць максімальна блізка да даты беларускіх — 18 верасня. Але фактычна выбары пачаліся ўжо 23 жніўня з датэрміновага галасавання жыхароў Камчаткі. Раней пачнецца галасаванне і ў іншых рэгіёнах, дзе выбаршчыкам цяжка дабрацца да ўчасткаў, каб ажыццявіць сваё права, да часткі з іх выбарчая камісіі прыедуць асабіста, і для гэтага будуць выкарыстоўвацца любыя неабходныя транспартныя сродкі, уключаючы верталёты.

Прадугледжана і актыўна выкарыстоўваецца датэрміновае галасаванне ў **Аўстраліі**. Так, на апошніх парламенцкіх выбарах, якія прайшлі 2 ліпеня 2016 года, датэрміновае галасаванне стартавала 14 чэрвеня. Скарысталіся гэтым правам выбаршчыкі, якія не маглі па ўважлівых прычынах прыняць удзел у парламенцкіх выбарах 2 ліпеня. Уважлівымі прычынамі лічацца: падарожжа, хвароба, адсутнасць на выбарчым участку ў сувязі з працоўным графікам. Аўстралійскія выбары цікавыя яшчэ і тым, што ў іх абавязаны ўдзельнічаць усе выбаршчыкі. Выбаршчык, які з няўважлівай прычыны не прагаласаваў, можа атрымаць штраф у 20 долараў, а ў некаторых выпадках штраф можа дасягнуць 170 долараў ці магчымы арышт маёмасці. Апроч таго, прыняць удзел у выбарах можна толькі на аснове папярэдняй рэгістрацыі. Грамадзянін, які не захоча рэгістравацца, будзе аштрафаваны на 110 долараў.

**У Аўстрыі** датэрміновае галасаванне таксама набывае ўсё большую папулярнасць. Яно ўключае, у тым ліку, магчымасць датэрмінова прагаласаваць па пошце — з выкарыстаннем спецыяльнай паштовай карткі. На прэзідэнцкіх выбарах 2010 года такую картку выкарыстала 6 працэнтаў выбаршчыкаў, а на выбарах 2016 года на рукі былі выдадзены 641 975 спецыяльных паштовых картак, або каля 10 працэнтаў ад колькасці выбаршчыкаў, якія маюць права голасу. Іншая справа, што вынікі прэзідэнцкіх выбараў 2016 года былі адменены з прычыны масавых фальсіфікацый, і зноў сваё права на датэрміновае галасаванне выбаршчыкі Аўстрыі змогуць рэалізаваць перад выбарамі, якія будуць праходзіць 2 кастрычніка.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук.**

❍ Тым часам

# У ВЕРХНЮЮ ПАЛАТУ ВЫБАРЫ ЎЖО ПАЧАЛІСЯ

Паводле каляндарнага плана арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбарчай кампаніі ў верхнюю палату парламента, выбары будуць праходзіць з 25 жніўня па 13 верасня ўключна, гэта значыць не пазней чым за 35 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Савета Рэспублікі дзейнага склікання.

Выбары сенатараў праводзяцца на аснове роўнага і ўскоснага выбарчага права пры таемным галасаванні на пасяджэннях мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню ў кожнай вобласці і Мінскага гарсавета.

Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў установіць вынікі выбараў членаў Савета Рэспублікі і зарэгіструе выбраных сенатараў не пазней за 30 верасня.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

Наталля КАЧАНАВА:

# «Ключавое звяно — гэта настаўнік»

**Да 1 лістапада ўрад павінен унесці шэраг прапаноў па стымуляванні працы і павышэнні статусу педагагічных работнікаў. Пра гэта на жнівеньскім форуме «Сталічная адукацыя. Стратэгіі развіцця» паведаміла намеснік прэм'ер-міністра краіны Наталля КАЧАНАВА.**

— Я ні ў якім разе не лічу прафесію педагога непрэстыжнай. Гэта пацвярджаюць і вынікі прыёмнай кампаніі. Мы бачым, што на педагагічныя спецыяльнасці абітурыенты ідуць даволі ахвотна, — падкрэсліла яна ў сваім выступленні перад удзельнікамі форуму. — Педагогаў у нас у краіне рыхтуюць 10 ВНУ, але ў сталіцы не хапае кадраў у дашкольных установах і пачатковай школе. У 2015 годзе Мінск падаў заяўку на размеркаванне ў сістэму адукацыі сталіцы 1200 маладых спецыялістаў, а накіравалі ў горад толькі 622. Давайце разбірацца, чаму? Не хапае сярод выпускнікоў мінчан? Калі ў Мінску ёсць у сістэме адукацыі кадравая праблема і пры гэтым ёсць ахвотныя застацца працаваць з іншагародніх выпускнікоў, горад павінен падумаць, як забяспечыць іх жыллём, як прадастаўляць ім месца хоць бы ў інтэрнаце. Бо ўсім зразумела, што заробку маладога спецыяліста не хопіць, каб заплаціць за арэнду жылля . Лічу, што патрабуецца глыбокі аналіз патрэбы ў кадрах сталічных устаноў адукацыі.

Натуральна, што ўсіх педагогаў напярэдадні новага навучальнага года хвалюе пытанне з зарплатай.

— Сказаць, што мы сёння знойдзем у бюджэце сродкі на павышэнне заработнай платы ўсім педагогам, будзе няпраўдай, — канстатавала Наталля Качанава. — Мы робім усё магчымае ў рамках эканамічнай сітуацыі, якая склалася. Вы ўсе цудоўна ведаеце, якая пільная ўвага надаецца сістэме адукацыі з боку кіраўніка нашай дзяржавы. Сістэма адукацыі працуе на будучыню краіны, і ўсе гэта разумеюць. У Прэзідэнта сёлета адбылося некалькі нарад па пытаннях развіцця адукацыі, і перад урадам была пастаўлена задача па матэрыяльным стымуляванні педагагічных работнікаў. Мы актыўна працуем у гэтым кірунку, і ўжо да 1 верасня будуць унесены змены ў нарматыўную базу, якія зробяць аказанне дадатковых адукацыйных паслуг ва ўстановах адукацыі больш выгадным як для іх кіраўніцтва, так і для педагогаў. Мы бачым, што кваліфікаваныя педагогі падпрацоўваюць па-за сценамі школ, там, дзе за іх працу плацяць больш. Трэба зрабіць так, каб педагогам было выгадна рабіць гэта ў школе, каб грошы, што атрымлівае ўстанова адукацыі ад пазабюджэтнай дзейнасці, заставаліся на месцы і накіроўваліся на павышэнне заработнай платы настаўнікам.



Наталля Качанава паабяцала тэрмінова ліквідаваць і «прававы казус» з кваліфікацыйнымі катэгорыямі педагогаў, якія займаюцца з дзецьмі ў рамках дадатковай адукацыі. На гэта скардзіліся дырэктары школ і гімназій. Сёння, напрыклад, настаўнік матэматыкі з першай ці вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй, які вядзе гуртук па матэматыцы, не можа разлічваць на даплату за сваю катэгорыю, таму што ён атрымлівае яе не як педагог дадатковай адукацыі.

Увогуле, на думку віцэ-прэм'ера, сістэму налічэння заработнай платы педагогам трэба спрашчаць: «Каэфіцыенты, тарыфы, даплаты, працэнты... Сістэма вельмі грувасткая...»

Сярэдні заробак у настаўнікаў у чэрвені бягучага года склаў 623 дэнамінаваныя рублі (гэта 89% ад сярэдняга заробку па краіне). Але ў чатырох абласцях сярэдні заробак педагогаў зраўняўся з сярэднім заробкам па рэгіёне. Праўда, Мінска гэта не датычыцца, хоць з мясцовага бюджэту педагогам і робяцца даплаты да аклада. Заробкі сталічных педагогаў па-ранейшаму адстаюць ад заробкаў прадстаўнікоў многіх прафесій. Ці не таму кадравая праблема ў дашкольных установах так і не вырашаецца?

Закранула Наталля Качанава і пытанне выканання педагогамі неўласцівых ім функцый:

— На ўзроўні ўрада мы прынялі ўсе меры, якія ад нас залежаць, і паставілі адпаведную задачу перад Міністэрствам адукацыі — зрабіць усё, каб педагогі займаліся толькі сваімі непасрэднымі задачамі і абавязкамі. І калі ўпраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі прапануе настаўнікам правесці тлумачальную работу з сем'ямі, у якіх ёсць запазычанасць па кватэрнай плаце, вы можаце смела такія прапановы ігнараваць.

Звяртаючыся да педагогаў, Наталля Качанава падкрэсліла, што ад іх працы, ад таго, ці бяжыць дзіця з радасцю ў садок ці школу, залежыць і настрой у кожнай сям'і. Якая б матэрыяльна-тэхнічная база ні была створана ў школе, усе разумеюць, што ключавое звяно — гэта настаўнік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

## ІЗНОЎ ВЫШЭЙ ЗА НОРМУ

**Месцамі прыпячэ да плюс 32 градусаў**

**Сіноптыкі Белгідрамецтэнтра паведамляюць, што ў гэтыя выхадныя будзе сапраўды цёпла і без ападкаў. А вось невялікае пахаладанне чакаецца толькі з аўторка.**

Напрыканцы тыдня пр тэмпературным агназуецца сонечнае і сухое надвор'е з фонам, які прыкладна на 1-5 градусаў перавысіць сваю кліматычную норму. У пятніцу установіцца сонечная пагода. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 23 градусаў па паўночным усходзе да 29 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Не чакаецца істотных ападкаў і ў выхадныя. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе складаць плюс 9—16 градусаў, а ўдзень суботы — ад 25 да 32 цяпла. Удзень у нядзелю — плюс 21—28 градусаў, а на поўдні краіны паветра прагрэецца да 29-32 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла, а ўдзень чакаецца плюс 25—32 градусы. Аднак у апошнія дні лета надвор'е падкіне нам не вельмі прыемны сюрпрыз, бо ўмовы крыху пагоршацца. У гэтыя дні праз тэрыторыю краіны пачне рухацца атмасферны фронт і пачнуць паступаць халаднаватыя паветраныя масы з боку Балтыйскага мора. Тады чакаюцца кароткачасовыя дажджы і паніжэнне тэмпературы паветра. У аўторак уначы па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—19 цяпла, удзень будзе плюс 18—25 градусаў, а па паўднёвым усходзе чакаецца яшчэ да плюс 26—29 градусаў. Месцамі кароткачасовыя дажджы пройдуць і ў сераду. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 цяпла, а ўдзень — толькі плюс 16—23 градусы. Хутка восень.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Хоцімск — горад хлебны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спецыялісты кажуць: дрэнна ўзарэш — ураджаю не чакай. Усе наступныя машыны будуць працаваць з прадукцыйнасцю на 30% меншай. Калі паверхня і глыбіня поля няроўныя, насенне ўзыходзіць нераўнамерна, а тэхніка пры апрацоўцы і ўборцы часцей псуецца і прастойвае. Да таго ж на кожным гектары крывой баразны траціцца паліва, што таксама павялічвае выдаткі. У маштабах краіны гэта шматмільярдныя страты. Дагледжаныя і прыгожыя палеткі — гэта ў першую чаргу заслуга адказных і старанных трактарыстаў.

Сёлета конкурс аратага ў Хоцімску праводзіўся як свята. На поле, дзе ўсё адбывалася, жыхары прыходзілі сем'ямі, з маленькімі дзецьмі. Гэта натхняла ўдзельнікаў, кожны стараўся паказаць усё, на што ён здольны. **Галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Хоцімскага райвыканкама Вольга КАЎТУНОВА** дэманструе мне тыя дыпломы, што атрымалі пераможцы ў спаборніцтвах на трактарах «Беларус 1221» і «Беларус 3022». Лепш астатніх з заданнямі справіліся Аляксандр Паўлюцін і Уладзімір Тамуленіс з гаспадаркі «Батаева» — у іх першыя месцы. Сяргей Кавалёў і Сяргей Гаўрыленка з гаспадаркі «Кастрычнік-Бярозкі» — на другім. Уладзімір Раманенка з «Бабулінага падворка» і Мікалай Яфрэменка з Хоцімскага льнозавода — на трэцім. Гэтыя людзі з раніцы да вечара ў полі, але вельмі хацелі, каб карэспандэнт «Звязды» ўбачыў пацвярджэнне пераможных імі хвіліны славы. Вольга Каўтунова з задавальненнем гэта зрабіла.

— Конкурс вельмі станоўча ўплывае на нашых працаўнікоў, — кажа яна. — Летась трактарысты з «Батаева» занялі 1-е і 2-е месцы, цяпер два першыя.

### Па галоўнай вуліцы на трактары, ды яшчэ і ў вышыванцы

Вольга Каўтунова лічыць, што хлебны фестываль даў бы механізатарам рэальную магчымасць паўней раскрыцца. А для большага азарту можна было б і расіян запрасіць. Да мяжы з гэтай краінай ад Хоцімска ўсяго некалькі кіламетраў.

— Нашы ўмельцы, ды плюс з іншых раёнаў, — хацелася б сабраць іх разам, каб маглі падзяліцца сакрэтамі, пераняць вопыт адзін у аднаго, — марыць Вольга. — А потым зрабіць для ўсіх свята на цэлы дзень. І каб побач з дарослымі весяліліся дзеці. Мы сёлета пыталіся ў зусім малых і падлеткаў, ці хацелі б яны, як іх бацькі, расціць хлеб. І некаторыя былі не супраць. Гэта радуе. Бо моладзь сёння імкнецца пазбягаць цяжкасцяў. А работа на зямлі заўсёды няпростая.

> **«На канапу сяду, лустачку соллю пасыплю, шклянку вады налью — і няма для мяне лепей ежы на ўсім белым свеце».**

Галоўнай падзеяй фестывалю магло б стаць шэсце хлебаробаў, каб яны па-каралеўску выязджалі на сваіх машынах, ды яшчэ і ў вышыванках. Яшчэ больш эфектна атрымаецца, калі побач з бацькамі будуць сядзець і іх нашчадкі. Ёсць таксама задумка накрыць для галоўных герояў хлебнага свята вялікі драўляны стол проста ў полі. Каб яны маглі ў нефармальнай атмасферы бліжэй пазнаёміцца, пагутарыць паміж сабой.

Беларускі каларыт народнаму святу з задавальненнем прыдадуць мясцовыя майстрыхі. Тутэйшаму Дому рамёстваў усяго 8 гадоў, але ж гэта сапраўдны музей народнага мастацтва. Тут, калі што, не толькі фестывальныя кашулі для мясцовых трактарыстаў вышыюць, але і апрануць па ўсіх мясцовых традыцыях тутэйшых прыгажунь. **Дырэктар раённага Дома рамёстваў Людміла КРАСНІКАВА** дэманструе цэлую галерэю аўтэнтычных хоцімскіх строяў. У асноўным гэта святочныя варыянты — з вышыўкамі, рознымі ўпрыгажэннямі.

Тут жа, калі спатрэбіцца, і ручнікі для фестывалю саткуць. Каб караваі было на што пакласці. Людміла Краснікава падводзіць да рарытэтнага ткацкага станка, які тутэйшыя ўмельцы сабралі з 2 частак. Станіну прывезлі з Трасціно, а навой і ўсё астатняе — з Елаўца. Усё падышло і добра працуе. Ёсць тут яшчэ адзін станок, зроблены па прыкладзе старадаўняга. Яго выкарыстоўваюць на выязных майстар-класах.

У куточку прыткаіліся лялечныя баба з дзедам — твор мастацтва ў поўны рост. Менавіта так павінны выглядаць сапраўдныя беларускія пенсіянеры. Нездарма гэтая парачка карыстаецца поспехам у наведвальнікаў на розных фестывалях. З імі сфатаграфавалася, напэўна, ужо паўкраіны. А бабка пабывала нават на следчым эксперыменце. Дзесьці ў раёне забілі пажылую жанчыну, і праваахоўнікі пазычалі вялікую ляльку на ролю ахвяры.

Дарэчы, пра лялек. На хлебным свяце без іх нікак. Заходзім у пакой, дзе яны «нараджаюцца», і вочы разбягаюцца. На палічках і ў шафах абярэгі на ўсе выпадкі жыцця: ад хвароб, неўраджаю, нягод, пошасці. Траўніца, напрыклад, найлепшая суцяшальніца па жыцці, дапамагае яшчэ і ад хвароб. А вось 13 лялек ад ліхаманкі — іх у шэраг ставілі пры коміне, каб хваробы, якія прыходзілі ў дом, усяляліся ў іх. У канцы года лялек палілі і рабілі новых. Крупянічка стаяла на покуці, у ёй захоўвалася першая жменя збожжа, якая сеялася вясной. Лічылася, будзе добры ўраджай. Вядучка, лялька з агульнай рукой на дзіця і маці, — сімвал пераемнасці пакаленняў, мацярынскага клопату і любові. Берагіні-падарожніцы ахоўваюць у падарожжах. У іх нашы продкі перад тым, як адправіцца ў дарогу, насыпалі зерне і зямлю. Усе абярэгі — штучны тавар, бо нават тканіна выбіраецца «па навуцы». Вопратку для некаторых лялек шукалі па ўсёй краіне.

— У дзяцінстве не нагулялася ў лялькі, вось працягваю, — усміхаецца аўтар гэтых прыгажунь Таццяна Навумава. Уся сцяна за яе спінай у дыпломах з розных конкурсаў. — Я самавучка, чацвёрты год працую. Абрадавая лялька — гэта ж цэлы акіян народнай мудрасці. Стала гэтым цікавіцца, і столькі ўсяго адкрылася!..

### Хлеб на любы густ

Сёння Хоцімск забяспечвае смачным хлебам не толькі свой раён, але і суседнія — Клімавіцкі і Касцюковіцкі. У спісе прамысловага ўчастка мясцовага райпа 55 найменняў хлебабулачных вырабаў, з іх 25 — чарнеявага і фармавога хлеба. Белы хлеб пячэцца з пшанічнай мукі вышэйшага гатунку, а вось чорны — змешаны, робіцца з жытняй мукі двух відаў — абдзірнай і сеянай і 1-га гатунку пшанічнай.



Але Смаляковай мясіць цеста дапамагаюць машыны.

— Наш свежавыпечаны хлеб, па маніторынгу сярод насельніцтва, самы смачны. За адзін прысест можна з'есці цэлую булку. Да мяне госці прыехалі з Данбаса і на вячэру з'елі 4 булачкі з малаком, — наганяе слінкі па дарозе на мясцовы «хлебазавод» Вольга Каўтунова.

**Лабарант хімічнага аналізу Ганна СНЫТКО**, нягледзячы на абед, робіць для нас экскурсію па ўчастку.

— Цеста замешваем як на рошчыне, так і на заквасках. Закваску ў выглядзе малочнакіслых бактэрый заказваем у Мінску, а рошчыну для чорнага хлеба гадуем самі. Стараемся пазбягаць дабавак, таму хлеб атрымліваецца, як дамашні, — раскрывае яна сакрэты.

З белага хлеба ў Хоцімску вялікім попытам карыстаецца «Сямейка» — некалькі злучаных паміж сабой булачак. З чорнага перавага аддаецца фармавому. Ён больш танны.

Калісьці Надзея Мяхедзька з вёскі Ліпаўка таксама працавала на хлебазаводзе. Але сакрэтам выпечкі хлеба ў хатніх умовах валодае яшчэ з дзяцінства. Расказвае, што гэтай справе яе навучыла яшчэ маці. Дапытлівая дзяўчынка хутка зразумела, як гэта робіцца, а вось паспрабаваць пячы самастойна прымусіў выпадак. Маці трапіла ў бальніцу, а яна, як старэйшая дачка ў шматдзетнай сям'і, вымушана была стаць да печкі. Ну і што з таго, што яна на той момант толькі ў 7 клас перайшла. Усё ў яе атрымалася. Калі скончыла школу, пайшла працаваць на хлебазавод. Потым перакваліфікавалася ў даярку. Але хлеб ужо для сваёй сям'і пякла заўсёды. Гэта цяпер, калі дзеці раз'ехаліся па розных гарадах, замешвае цеста радзей. У асноўным на заказ для раённых мерапрыемстваў, або калі з горада прыязджаюць дзеці і ўнукі. Справа гэта нялёгкая. Спачатку цеста трэба добра вымесіць, а потым 8-9 гадзін чакаць, каб падышло. Потым падняцца ў 4 гадзіны раніцы і выпаліць у печы. Пячэ Надзея на спецыяльных скавародках або проста на драўлянай лапаце. Асабліва смачна атрымліваецца, калі пакласці ўніз пад сфармаваную булку капусны ліст. «На канапу сяду, лустачку соллю пасыплю, шклянку вады налью — і няма для мяне лепей ежы на ўсім белым свеце», — прызнаецца яна.

Прыемна, што ў раёне ёсць моладзь, якая цікавіцца старадаўнімі спосабамі вырабу хлеба. Двайняты Наталля і Вольга перанялі вопыт у маці, Надзеі Касцэнкі, а яна — у сваёй маці. Атрымалася добрая пераемнасць пакаленняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■ Свята едзе

Стартавала прафсаюзная акцыя «Мы — разам!»

# ПЕСНІ АД ЧЫГУНАЧНІКАЎ І НАФТАВІКОЎ

**Да канца кастрычніка канцэрты пад эгідай Федэрацыі прафсаюзаў пройдуць амаль у 40 гарадах. Яны будуць прымеркаваны да Дзён горада, «Дажынак», прафесійных і дзяржаўных свят. Каго з артыстаў чакаць у райцэнтрах і якіх працаўнікоў будуць ушаноўваць на мясцовых святах, расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце ФПБ Глеб ЛАПІЦКІ.**



— Акцыя праводзіцца другі год. Летась мы наведалі 57 гарадоў і сабралі больш за 100 тысяч гледачоў. Неад'емная частка мерапрыемства — канцэрт. Мы запрашаем выступаць прафсаюзныя творчыя калектывы, фіналістаў конкурсу «Новыя імёны». Са славутых — напрыклад, «Цернiцы» Беларускай чыгункі, ансамбль «Стрэчанне» Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Гэта сапраўдныя прафесіяналы, якія нічым не саступаюць папулярным артыстам. У якасці падарунка ў Год культуры запрошаным на канцэрт калектывам уручаюць сертыфікаты на матэрыяльна-тэхнічнае аснашчэнне.

Таксама прывозім у гарады вядомых беларускіх артыстаў. У рамках акцыі выступяць Вольга Плотнікава, Ірына Дарафеева, Саша Нэма, Аляксей Хлястоў, Вікторыя Алешка, групы «Бай Сіці», Navi. Гэта тыя, хто дапамог нам знайсці народныя таленты. Падчас конкурсу «Новыя імёны» яны разам з намі ездзілі на заводы, займаліся з работнікамі сцэнічным майстэрствам.

***— Што, акрамя канцэртаў, чакае жыхароў гарадоў? Куды завітае акцыя?***

— Сёлета з намі ездзіць прафсаюзны тураператар «Беларустурыст», расказвае, якія ёсць пуцёўкі, зніжкі. А спецыялісты «Белпрафсаюзкурорта» папулярызуюць здаровы лад жыцця. І, вядома, для федэрацыі самае галоўнае — гэта абарона правоў чалавека, таму падчас акцыі праводзім юрыдычныя кансультацыі. Нашы спецыялісты адказваюць на пытанні наконт заробкаў, падліку працоўнага часу, дзіцячых дапамог. Каб людзі разумелі, што Федэрацыя прафсаюзаў — гэта арганізацыя для іх. І яны плацяць узносы не проста за тое, што ім на 8 сакавіка зробяць падарунак.

***— Добрай традыцыяй стала таксама ўшанаванне працоўных дынастый.***

— Так, гэта асноўны складнік мерапрыемства. У кожным раёне старшыні галіновых і мясцовых камітэтаў прафсаюзаў выбіраюць працоўныя дынастыі, якія мы падчас канцэрта запрашаем на сцэну. Расказваем пра іх, паказваем. Бо людзі нават не ведаюць, што побач з імі жывуць сем'і, дзе некалькі пакаленняў працавалі педагогамі, трактарыстамі, сталярамі, банкаўскімі работнікамі.

На пятым Усебеларускім сходзе і кіраўнік дзяржавы, і старшыня ФПБ вялікую ўвагу ўдзялялі настаўніцтву. Таму сёлета мы ящчэ ўшаноўваем і настаўнікаў. Яны выхоўваюць маладых спецыялістаў, дапамагаюць ім уліцца ў калектыў. Самае паказальнае куратарства ў ахове здароўя, педагагічнай сферы, прамысловасці.

***— Як выбіраюцца гарады, дзе будуць праводзіцца мерапрыемствы?***

— Летась у нас быў заяўны прынцып. Сёлета едзем у рэгіёны, дзе не былі мінулым разам, — у Драгічын, Лельчыцы, Свіслач, Лунінец, Баранавічы, Смалявічы, Рэчыцу і іншыя гарады. Хочацца ахапіць усе тэрытарыяльныя цэнтры. Плюс наведаем абласныя «Дажынкі», каб павіншаваць хлебаробаў.

***— Як сустракаюць прафсаюзныя канцэрты ў рэгіёнах?***

— Колькасць людзей, якія збіраюцца, залежыць ад пляцоўкі. У Старых Дарогах мы выступалі ў зале, прыйшло 500 чалавек, у Ельску — у скверы, тысячы паўтары-дзве гледачоў. Для людзей гэта свята.

***— Акцыя «Мы — разам!» лічыцца патрыятычнай. Чаму такі статус?***

— Адна з мэтаў Федэрацыі прафсаюзаў — прывіваць любоў да Радзімы. Нашы фіналісты ў рамках гэтай акцыі прэзентуюць цяпер новы набор песень. Гэта песні, якія былі 100-200 гадоў таму. Мы зрабілі для іх новыя аранжыроўкі, надалі іншае гучанне, запісалі кліпы для тэлебачання. А ящчэ падчас канцэртаў нагадваем, што ўсё добрае, што ёсць у нашай краіне, створана і захавана дзякуючы нашым людзям, таму што мы — разам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by* ■

# РАСПЛАТА ЗА ЗВЫЧКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У апошнія пяць гадоў захоўваецца тэндэнцыя зніжэння колькасці абортаў. З кожнай пацыенткай, якая прымае падобнае рашэнне, праводзіцца абавязковае перадабортнае кансультаванне. Такая псіхалагічная дапамога арганізавана ўжо ў кожнай сталічнай паліклініцы, развіваецца напрамак і ў рэгіёнах, а ў найбліжэйшай перспектыве гэта будзе работа з парай.

«Каля 8 працэнтаў жанчын прымаюць рашэнне аб захаванні цяжарнасці ў выніку такога кансультавання, — адзначае **галоўны акушэр-гінеколаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына ІКАНАСТАСАВА**. — Лічба пакуль невялікая, аднак працяг такой работы можа забяспечыць больш значны вынік».

Зніжаецца і колькасць абортаў у непаўналетніх. Як лічаць спецыялісты, дзякуючы ў тым ліку рабоце цэнтраў дружалюбнага стаўлення да падлеткаў (у Мінску такіх восем). Тут кансультуюць гінеколагі, уролагі і псіхолагі. Падлеткі могуць звяртацца і самастойна, і з бацькамі. Год таму на базе 2-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы з'явіўся і гарадскі кабінет дзіцячага гінеколага.

## БАЦЬКАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА

Удасканаленне нацыянальнай службы планавання сям'і прадугледжвае больш актыўнае ўцягванне ў абследаванні і кансультацыі мужчын. Разам з тым патрабуецца і далейшае ўдасканаленне медыцынскіх, прафілактычных тэхналогій захавання рэпрадуктыўнага патэнцыялу жанчын. Тут і стварэнне кабінетаў ранняй прафілактыкі рэпрадуктыўных захворванняў, хуткая і даступная дапамога ў родах, сучасны маніторынг стану і цяжарнай, і парадзіхі, своечасовае аказанне медпамогі нованароджанаму ў крытычнай сітуацыі, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы па аказанні рэанімацыйнай дапамогі, рэабілітацыя дзяцей, якія перанеслі крытычны стан.

— Летась краіна дасягнула самага нізкага біялагічна кіраванага ўзроўню дзіцячай смяротнасці, — кажа **загадчыца лабараторыі клінічнай неанаталогіі, рэабілітацыі нованароджаных і дзяцей першага года жыцця РНПЦ «Маці і дзіця» Тацццяна ГНЯДЗЬКО**. — Разлічваць у далейшым на ранейшы тэмп зніжэння гэтага паказчыка не даводзіцца. Мы павінны гаварыць аб тым, што для паляпшэння сітуацыі з нараджальнасцю важнае значэнне будзе мець зніжэнне смяротнасці ад прычын, якія можна папярэдзіць ва ўзросце ад 0 да 4 гадоў. Самае цяжкае — папярэдзіць нешчаслівыя выпадкі, атручэнні, падзенні з вышыні... Таму на першы план выходзіць прафілактыка, інфармаванне і навучанне бацькоў правільнаму абыходжанню з дзецьмі.

## САМ САБЕ ВОРАГ

— Сістэма аховы здароўя працуе ўжо з захворваннем, а мы плануем большую ўвагу надаваць прафілактыцы — навучаць здароваму ладу жыцця, паведамляць пра фактары рызыкі развіцця тых ці іншых захворванняў, а заадно ўзмацняць адказнасць за ўласнае здароўе, — адзначае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі першаснай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла ЖЫЛЕВІЧ**. — Большасць нашых грамадзян вылучае здароўе на першыя пазіцыі ў ліку каштоўнасцяў, але значна меншая колькасць дэманструе адказнасць у яго захаванні. Злоўжыванне алкаголем, курэнне, нізкая фізічная актыўнасць, няправільнае харчаванне — усё гэта прыводзіць да развіцця сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў, якія ўносяць самы важкі ўклад у смяротнасць ва ўзросце да 70 гадоў. Аднак калі мы кажам пра гэта пацыенту, ён нібыта не чуе...

Сёння больш за 30 працэнтаў беларусаў кураць, і хоць колькасць курцоў сярод мужчын крыху знізілася ў параўнанні з савецкім часам, штогод ад прычын, звязаных з курэннем, паміраe больш за 15 тысяч чалавек, палова з якіх — працаздольнага ўзросту. Артэрыяльная гіпертэнзія ёсць у 40 працэнтаў беларускіх мужчын і 38 працэнтаў жанчын. Павышаны халестэрын — у паловы мужчын і трэці жанчын працаздольнага ўзросту. Нізкая фізічная актыўнасць — у кожнага чацвёртага, а лішняя вага — у больш як 40 працэнтаў дарослых. Адкуль жа возьмецца здаровае сэрца і сасуды? Цалкам заканамерна, што смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту ў 6 разоў большая, чым у жанчын!

## СЭРЦА НЕ ВЫТРЫМЛІВАЕ

Ад захворванняў сістэмы кровазвароту пакутуе 2,5 млн беларусаў — тут і артэрыяльная гіпертэнзія, і ішэмічная хвароба сэрца. За 15 гадоў колькасць такіх хворых вырасла фактычна ў 2 разы. І гэта не проста лепшае выяўленне паталогій, але і аб'ектыўны рост колькасці сталых пацыентаў, тлумачыць **намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр ПАЦЕЕЎ**.

У структуры прычын гібелі людзей хваробы сістэмы кровазвароту складаюць 52-55 працэнтаў. Разам з анкалагічнымі, абструктыўнай хваробай лёгкіх і цукровым дыябетам сардэчна-сасудзістая паталогія складае групу неінфекцыйных захворванняў, на якія прыпадае 89 працэнтаў усіх смерцяў.

Сумесна з Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя цэнтр «Кардыялогія» праводзе восенню дэталёвае даследаванне фактараў рызыкі сардэчна-сасудзістай паталогіі, каб павысіць эфектыўнасць прафілактыкі ў нашай папуляцыі. Аднак папярэдняе вывучэнне сітуацыі паказвае, што асноўнымі фактарамі рызыкі сардэчна-сасудзістай паталогіі для мужчын у любым выпадку з'яўляюцца алкаголь, тытунь і павышаны артэрыяльны ціск, для жанчын — артэрыяльная гіпертэнзія, высокі халестэрын і лішняя вага. Статыстыка сведчыць, што смяротнасць сярод мужчын ва ўзросце 40-44 гадоў у 9 разоў перавышае ўзровень смяротнасці жанчын-равесніц (у працаздольным узросце — у 6 разоў). Калі паўплываць на паводзіны нашага мужчынскага насельніцтва, цалкам магчыма знізіць смяротнасць у працаздольным узросце на 30 працэнтаў.



Фота БЕЛТА.

## ПАКУЛЬ НЯМА СКАРГАЎ

На 80 працэнтаў поспех у барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі залежыць ад прафілактыкі. Значную частку сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў можна папярэдзіць — не адмяніць, вядома, смерць у прынцыпе, а не дапусціць заўчасной гібелі.

Вінаватыя ў развіцці анкалагічных захворванняў усё тыя ж ворагі сардэчна-сасудзістай паталогіі — няправільнае харчаванне, атлусценне, дэфіцыт фізічнай актыўнасці, курэнне. І не варта звязваць курэнне выключна з ракам лёгкага — навукова даказана сувязь гэтай залежнасці з дзясяткам іншых захворванняў, напрыклад ракам мачавога пузыра.

За апошнія 50 гадоў дасягнута пэўная мяжа ў дыягностыцы раку на ранніх стадыях — 56 працэнтаў усіх выпадкаў. Гэты ўзровень ужо не мяняецца, і рабіць стаўку варта не столькі на новыя апараты, колькі на скрынінг — пошук захворвання ў здаровых людзей, якія ні на што не скардзяцца. Ад ранняй дыягностыкі нікто, вядома, таксама не адмаўляецца, але наш чалавек ігнаруе такую магчымасць, цягне час, пакуль добра не прыцісне. Працяг жа пілотных праектаў скрынінгу раку прастаты, малочнай залозы, каларэктальнага раку паказвае ўжо сваю эфектыўнасць. У межах скрынінгу раку прастаты не выяўлялася 4-й стадыі.

Для правядзення скрынінгу раку шыйкі маткі цэнтр анкалогіі атрымае напрыканцы года неабходнае абсталяванне, што прадугледжана праграмай «Здароўе народа» (абласныя цэнтры будуць укамплектаваны цягам наступных чатырох гадоў). Адначасова спецыялісты робяць стаўку на растлумачэнне неабходнасці вакцынацыі ад віруса папіломы чалавека, які выклікае гэты від раку ў жанчын.

**23.05** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Берлін.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**11.50 Маст. фільм «Розыгрыш».**
**13.25 Трагікамедыя «Асенні марафон».**



**15.00** «Яўген Лявонаў. «Я кароль, дарагія мае!»
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Маршрут пабудаваны».
**17.55** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.55** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35** «Спектакль...» Сольны канцэрт Паліны Гагарынай.
**0.05 Маст. фільм «Слушныя хады».**

### СТБ

**6.05 «Фірменная гісторыя». Серыял.**
**7.40 Меладрама «Чужы білет».**
**9.30** «Ежа багоў».
**10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Участак лейтэнанта Качуры». «Смяротны танец». 1—2 серыі.**
**13.50, 0.40 Меладрама «Трамвай у Парыж».**
**15.50** «Вялікі горад».
**16.50** «Наша справа».
**17.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.50 Камедыя «Белыя Росы».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Вялікія тайны».
**22.55 «Крапавы берэт». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00, 8.20, 3.20** М/ф.
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Мой лепшы сябар».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік».
**10.45, 23.05 Маст. фільм «Пакроўскія вароты».**
**13.15** «Цяжар абеду».
**13.45 Маст. фільм «Адкрытае мора: Новыя ахвяры».**
**16.15 Серыял «Было каханне».**
**1.35 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Багатая Маша».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25 Маст. фільм «Сіцылійская абарона».**
**13.00, 15.15** «Гумар! Гумар! Гумар!»
**15.40 Маст. фільм «Барыста».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35 Маст. фільм «У палоне падману».**
**22.15** Урачыстае адкрыццё Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Новая хваля-2016».
**0.25 Маст. фільм «Домакіраўнік».**

### НТБ—Беларусь

**5.45** «Астрапрагноз».
**5.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі немаўляці».
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.10** «Я худзею».
**14.15 Серыял «Кодэкс гонару».**
**16.20** НТБ-Бачанне. «Дзеткі».
**17.15** «Героі нашага часу».
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.45** «Салтыкоў-Шчадрыншоу».
**22.40 Маст. фільм «Воўчы востраў».**
**0.10** «Крутыя нулявыя».

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.55, 21.15, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.40 Серыял «Сапраўдны дэтэктыў».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 16.00, 19.00, 21.00** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.30** Мультпарад.
**16.30** «Лэдзі-дэтэктыў».
**17.30, 19.10, 20.00 Серыял «Навальнічны час».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Снайпер».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Тры каты».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Рэаліці-шоу «Новае жыццё».
**13.00, 23.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.00, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**15.00** Баявік «Васабі».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**20.30** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.30** Да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Лявонава. «Данская аповесць». Маст. фільм.
**12.00** «Астравы». Яўген Лявонаў.
**12.40** Пернікавы домік. «Манастырскае мастацтва».
**13.10** «Крылатая палярная зорка». Дак. фільм.
**14.05** Выпускны вечар Акадэміі рускага балета ім. А Я. Ваганавай у Марыінскім тэатры.
**16.10, 1.55** Па слядах тайны. «НЛА. Прышэльцы ці суседзі?»
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «75 гадоў з дня нараджэння пісьменніка. «Жыццё нялёгкае... Ваш Сяргей Даўлатаў». Дак. фільм.
**18.20** «Прыгоды Цератопса». Дак. фільм.
**19.15** Да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Лявонава. «Звычайны цуд». Маст. фільм.
**21.40** «Рамантыка раманса». Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».
**22.40** Да 65-годдзя Аляксея Учыцеля. «Космас як прадчуванне». Маст. фільм.
**0.10** Д. Брыджуотэр, Я. Андэрсан, Б. Лагрэн і Сімфанічны аркестр венскага радыё ў канцэрце з Вены «Дух Моцарта».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**7.00, 8.30, 9.40, 13.00, 14.30, 15.40, 18.40, 19.10, 20.20, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная Настальгія.
**7.30, 13.30, 1.30** Маст. фільм «Госця з будучыні».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** «Песня-77».
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1963. 1-я частка. 2010 год.
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Кінапанарама» з Э. Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 1-я частка. 1982 год.
**18.00** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Праблема грошай». 1993 год.
**18.50** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1995 год.
**19.20** «Вясёлыя рабяты». 1990 год. 2-я частка.
**20.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Аркадзь Райкін. 1996 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Жнівень, які збягае».
**23.20** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год.
**0.00** «Спяем, сябры!» з Натальляй Казялковай. 2005 год.

### EuroSport 1

**4.00, 8.30, 10.30, 19.00, 22.15, 2.15** Тэніс. US Open.
**8.00, 11.15, 14.30** Тэніс. US Open. Агляд гульнявога дня.
**9.30, 11.45, 13.00** Велаcпорт. «Вуэльта».
**12.45, 18.45** Велаcпорт. «Вуэльта»-экстра.
**22.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».

### Кінакамедыя

**1.10** Камедыя «Жудасны Генры».
**2.50** Камедыя «Выпадковы муж».
**4.30, 14.00** Скетчкам «Паміж намі».
**4.50** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**6.35** Меладрама «Ажанюся з першай сустрэчнай».
**8.15** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**10.00** Камедыя «Няўлоўная чацвёрка».
**12.20** Камедыя «Вяселле па абмене».
**14.00** Скетчкам «Паміж намі».
**14.35** Камедыя «Леа і Беа».
**17.40** Камедыя «Дзікая штучка».
**19.30** Камедыя «Бясплатныя ўзоры».
**21.00** Камедыя «Бармэн».
**22.45** Камедыя «Укол парасонам».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 1.00** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.15** «Монстры на канікулах». Анімацыйны фільм.
**16.35** «Блокбастары».
**17.35, 4.15** «Алігарх ТБ».
**18.10** «Хэллоў, Раша!»
**19.05** «Масква — не Масква». Меладрама.
**21.00** «Прывідны гончшык». Фэнтэзі.
**23.05** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.



**4.40** «Я і мая фобія».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Трылер «Ідэнтыфікацыя».
**8.10, 22.10** Трылер «Востраў праклятых».
**10.30** Камедыя «А вось і яна».
**12.10** Драма «Прынцэса Манака».
**14.10** Трылер «Айчым».
**16.10** Драма «Марыя — каралева Шатланды».
**20.10** Меладрама «Спадарыня пакаёўка».
**0.10** Камедыя «Закаханы Шэкспір».
**2.20** Фэнтэзі «Як зладзіць монстра».
**4.00** Трылер «Нічога асабістага».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Дак. фільм «Канец выдатнай эпохі. Пра фільм і не толькі...»
**6.50** Драма «Канец выдатнай эпохі».
**8.35** Камедыя «Прыстойныя людзі».
**10.15** Драма «Пушкін: апошняя дуэль».
**12.15** Прыгоды «Што ў Сенькі было».
**13.40** Камедыя «Утаймавальнікі веласіпедаў».
**15.00** Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
**17.05** Драма «Палонны».
**18.35** Драма «Выратаванне».
**20.20** Драма «Легенда №17».
**22.40** Камедыя «Вяселле па абмене».
**0.20** Баявік «Крыжаносец».
**2.20** Трылер «Клетка».
**4.30** Камедыя «Пах верасу».

### National Geographic

**6.00** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**6.50, 13.10** Гульні розуму.
**7.10, 13.30, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**10.00** Дзікі тунец.
**10.45** Золата Юкана.
**11.35, 23.20** Расследаванні авіякатастроф.
**12.20** 80-я. Дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**14.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**19.25** Космас. Прастора і час.
**21.00, 0.55, 4.00** Хасельхоф супраць Берлінскай сцяны.
**21.45, 1.40, 4.50** Зона 51. Сакрэтныя файлы ЦРУ.
**22.35, 2.30** Карставыя варонкі.
**0.10, 3.15** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00** Смяротны ўлоў.
**9.00, 2.00** Першапраходцы.
**10.00** Амерыканскі Тарзан.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.00** Бітвы за кантэйнеры.
**13.00** Паляўнічыя на склады.
**14.00** Махінатары.
**15.00, 2.55, 6.20** У пагоні за класікай.
**16.00, 5.30** Вулічныя гонкі.
**17.00** Пешшу ўздоўж Ніла.
**21.00** Трасы Калыма.
**22.00, 7.10** Як працуюць машыны.
**23.00** Мегаперавозкі.
**0.00** Паляванне на труфелі.
**1.00** Лясны патруль.
**3.50** Тэлескоп.

## 9 фактаў пра...

# ДЫРЫЖАБЛІ

**Дзякуючы французскаму дзеяслову са значэннем «кіраваць» у нашай мове з'явіліся як мінімум два словы. Адно з іх — дырыжор — чалавек, які кіруе музыкамі, а другое — дырыжабль — кіраваны аэрастат.**




**1.** Дырыжаблем называюць лятальны апарат, лягчэйшы за паветра, аэрастат з рухавіком. Рухавік і дазваляе дырыжаблю рухацца незалежна ад напрамку паветраных патокаў. Да дырыжабляў чалавецтва, якое марыла аб небе, абыходзілася паветранымі шарамі-мангальфьерамі.

**2.** Вынаходнікам дырыжабля лічаць французскага матэматыка Жана Батыста Мары Шарля Менье. Ён прыдумаў усё: форму эліпсоіда, тры прапелеры для кіравання, якія павінны былі круціць уручную аж 80 чалавек, дзве абалонкі — каб зміняць аб'ём газу, і, адпаведна, вышыню палёту.

**3.** Ажыццявіў ідэі Менье іншы чалавек, таксама француз — інжынер Анры Жыфар. Ён сканструяваў першы ў свеце дырыжабль з паравым рухавіком магутнасцю ў тры конскія сілы. У верасні 1852 года Жыфар падняўся на ім над Парыжскім іпадромам і праляцеў каля 30 кіламетраў з сярэдняй хуткасцю 10 км/г. Ад гэтага палёту і адлічваюць эру маторнай авіяцыі і эру дырыжабляў.

**4.** Яшчэ праз дваццаць гадоў на падобны лятальны апарат усталёвалі рухавік унутранага згарання — гэта зрабіў нямецкі інжынер Паўль Хенлейн.



**5.** Дырыжабль Жыфара прынята называць мяккім дырыжаблем. У такіх сістэмах корпус з матэрыі служыць таксама абалонкай для газу. Цыялкоўскі адзначаў недахопы такіх дырыжабляў: немагчымасць трымаць вышыню, высокая верагоднасць пажараў, дрэнная гарызантальная кіруемасць. Калі ў ніжнюю частку абалонкі ўсталяваць металічную ферму, то атрымаецца паўцвёрды дырыжабль — такой была знакамітая «Італія» Умберта Нобіле.

**6.** Цыялкоўскі крытыкаваў мяккія дырыжаблі не галаслоўна, бо яшчэ ў 80-х гадах XIX стагоддзя ён распрацаваў праект вялікага грузавога дырыжабля цвёрдай канструкцыі з металічнай абшыўкай.

**7.** Прыдуманае ў Расіі ажыццявілі ў Германіі. На ўласныя сродкі граф Цэпелін пабудаваў дырыжабль цвёрдай сістэмы і асабіста выпрабаваў яго. Да Першай сусветнай вайны дырыжаблі графа, якія ў яго гонар назвалі «цэпелінамі», сталі сродкам перамяшчэння.

**8.** У вайну цэпеліны бамбілі Лондан, пасля яе заканчэння — чаўнакамі маталіся цераз Атлантыку, а адзін нават здзейсніў кругасветны пералёт. Падвёў цэпеліны вадарод, які выкарыстоўвалі замест гелія: пасля выбуху і пажару дырыжабля «Гіндэнбург», празванага «нябесным «Тытанікам», цэпеліны сышлі ў гісторыю.

**9.** У СССР першы дырыжабль пабудавалі ў 1923 годзе. Потым пры галоўным упраўленні Галоўпаветрафлота стварылі «Дырыжаблябуд» і запрасілі ў канструктары Нобіле. Той справіўся і стварыў паўцвёрды савецкі дырыжабль «СССР В-5». Потым стварылі «СССР В-6», і ён нават усталяваў сусветны рэкорд працягласці палёту ■

**НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ**

**Раіса Сцяпанаўна Васільева нарадзілася ў Мазыры. Шмат гадоў працавала настаўніцай матэматыкі. Вось так: сінус, бісектрыса, тэарэма і — метафара, ямб, катрэн... Здавалася б, таму, хто ўсё сваё жыццё прысвяціў дакладным навукам, наўрад ці стане цікава спасцігаць сумніўныя законы зусім іншай прафесіі, дзе цяжка абысціся без уласнай фантазіі і ўяўлення. Але Раіса Сцяпанаўна сваім прыкладам даказала адваротнае і, развітаўшыся са школай, актыўна пачала пісаць вершы і прозу. Адно з яе апавяданняў мы і прапануем увазе нашых шаноўных чытачоў.**

**Алесь БАДАК.**

# ДАРУЙ, ПРАБАЧ, МАЁ КАХАННЕ...

Жыццё наша такое кароткае і такое доўгае — як на гэта паглядзіш.

Так ці інакш, але ўчынкаў за час жыцця зроблена такое мноства, што падумаць страшна. Усялякіх: і добрых і не вельмі добрых. А ўжо благіх... як падумаеш добра, то ў вялікі абярэмак не ўбярэш.

За некаторыя ты ўжо спаўна расквітаўся ў свой час. А некаторыя застаюцца вісець цяжкім грузам аж да канца жыцця. І не даюць спакою, муляюць і муляюць, шкрабуць і шкрабуць цябе знутры, выклікаючы хваляванне сэрца, а адчуванне сораму полымем чырвані пакрывае твар.

І нікуды ты не схаваешся, бо гэта, мабыць, Божы суд цябе судзіць, вечна нагадваючы, які ты часам быў «добры» на працягу свайго жыцця. І як бы ты ні спрабаваў хоць на маленечкую частачку зменшыць сваю віну, неяк упэўніць сябе, што ты быў вымушаны абставінамі зрабіць так, а не інакш, усё роўна ўнутраны голас не супакоіцца, будзе даводзіць, што ты хлусіш сабе.

Вось за адзін такі свой учынак і пакутуе Вольга Цітаўна ўсё жыццё.

Гэта зараз яна Вольга Цітаўна — сталая жанчына, якая прайшла ўжо ўсе жыццёвыя этапы. А ў тыя пасляваенныя гады была яна маладзенечкай дзяўчынкай Волечкай.

Маладосць ёсць маладосць. І хто ў гэтым узросце не закахаўся? У свой час і Волечка сустрэла сваё каханне.

Спачатку яна толькі насміхалася з цыбатага сарамлівага хлопца, які прыходзіў да яе сястры па падручнікі (яны разам вучыліся). Ды незаўважна адчула ў сабе патрэбу бачыць яго кожны дзень. Яшчэ не верачы самой сабе, час ад часу кідала позірк на сцяжынку з надзеяй, што вось зараз на ёй з`явіцца той, каго супраць волі сваёй чакала пабачыць. Тады ж сэрцайка яе адчула, што і яна неабыякавая для яго, што і яго позіркі не-не ды затрымліваюцца на ёй.

І вось аднойчы, можна сказаць, нечакана, іх позіркі сустрэліся. Абое збянтэжыліся, пачырванелі, адчулі нейкі ўнутраны штуршок, нібы хтосьці спрабаваў нахіліць іх адзін да аднаго.

Імгненне — і знешні выгляд не нагадваў пра тое, што адбылося нешта неардынарнае. Але знутры праскочылі іскрынкі такога напружання, няйначай адбыўся атамны выбух.

У рэшце рэшт, Волечка адчула на сабе такі ўмольны позірк Валодзі (так звалі хлопца), які як бы казаў: «Выйдзі мяне праводзіць, інačай я памру!» Яна і сама даўно чакала таго знаку.

Праз дзве сустрэчы яны зразумелі, што кахаюць, кахаюць моцна і на ўсё жыццё. Але вось тое, што такое вялікае шчасце прыходзіць не да кожнага, што яго трэба берагчы, як вялікі падарунак з неба, іх маладым розумам было недасягальна.

Яны кахалі. Іх нішто не хвалявала. Здавалася, што ніздзе няма ніякіх перашкод для іхняга такога моцнага і шчырага пачуцця. Волечка з Валодзем да світання гулялі па вуліцах невялікага гарадка, у якім жылі. Часам сядзелі на абрывістым схіле рэчкі, па якой плылі буксіры, сплаўляючы плыты. Агні гэтых начных працаўнікоў асвятлялі бераг і траплялі на закаханых, якія, прытуліўшыся адзін да аднаго, мабыць, нічога не бачылі і не чулі, акрамя грукату сваіх сэрцаў.

Аднойчы Валодзя з Волечкай сядзелі на лавачцы ў ціхім закуточку парку. Нечакана Волечка дастала з кішэні прыгожую-прыгожую насоўку, якая была аздоблена карункамі з жоўтых нітак. «Валодзя, гэта я табе падрыхтавала падарунак, каб ты пра мяне заўсёды памятаў і ведаў, што я цябе вельмі кахаю».

Пабачыўшы такі падарунак, Валодзя аж уздрыгануўся і абедзвюма рукамі адхіліў яго. «Што ты, што ты! Хіба ты не ведаеш, што насоўка ў падарунак — знак разлукі? Ды яшчэ з жоўтымі карункамі».

«І ты верыш у нейкія забабоны? Бяры! Я ж табе ад шчырага сэрца, на памяць», — супакоіла Волечка.

Не ведала тады Волечка, што гэтую горкую разлуку праз колькі часу яна і падорыць свайму каханаму Валодзю.

Прыйшоў час развітацца. Лёс раскідаў іх у розныя бакі. Развіталіся і пакляліся, што каханне іх вечнае, што нішто і ніхто іх не разлучыць. І, нават, прызначылі час сустрэчы.

Але адбылося непапраўнае... Праз непрацяглы час на жыццёвым шляху Волечкі сустрэўся добры хлопец, які закружыў ёй галаву і звёз некуды далёка. Нельга сказаць, што яна так лёгка адкінула ўбок сваё каханне. Не, спачатку ёй цяжка было адчуваць, што не Валодзя будзе ісці з ёю разам па жыцці. Але перамагло тое, што побач быў малады, прыгожы, вельмі абыходлівы, перспектыўны хлопец. А Валодзя?.. Дзе той Валодзя? І дзяўчына здалася.

Можна сказаць, што яна не прагадала. Сямейнае жыццё яе ўдалося. І зараз, у вельмі сталым узросце, Вольга Цітаўна разам са сваім на ўсё жыццё абраным чалавекам. Ёсць у іх і дзеці, і ўнукі. Ёсць і шчасце. Але тое далёкае каханне ў маладосці не выкрасліць з сэрца. То і не дзіва: гэта быў знак аднекуль зверху.

А вось што не зберагліся тое каханне, Вольга Цітаўна віны з сябе ніколі не здымала.

Таму і дасюль шчыміць сэрца пры ўспамінах. Калі-нікалі дастане яна ўпотай з пакунка фота свайго даўняга каханага, глядзіць яму ў вочы і просіць, просіць прабачэння.

**Раіса ВАСІЛЬЕВА**



## ■ Неасабісты суб'ектыў

# ГАННА НА ШЫІ



## Як з нармальных дзяцей гультаі атрымліваюцца

Дачка суседзяў не паступіла ва ўніверсітэт — не хапіла балаў. Сядзяць цяпер усёй сям'ёй кожны вечар і... не, не будуюць планы, куды маладой здаровай дзяўчыне ўладкавацца працаваць ці якую прафесію атрымаць, — гаруюць. Лічаць сямейны бюджэт, рыхтуюцца эканоміць, бацька, выкладчык каледжа, успамінае студэнцкае мінулае і падумвае, ці не пайсці куды грузчыкам падпрацоўваць... Бо вырашылі, што гэты год іхняя Ганначка пасядзіць дома, рыхтуючыся да чарговага штурму факультэта міжнародных адносін (і ніякага іншага!), а калі раптам зноў не атрымаецца, дык за год ужо збяруцца грошы, каб забяспечыць ёй навучанне хаця б на платным аддзяленні таго жаданага факультэта. Бо нікім іншым як дыпламатам Ганна сябе не бачыць, а бацькі ж не будуць таптаць мару адзінай любімай дачушкі.

Ганна актыўна «рыхтуецца». Спіць да абеду, з'ядае сняданак, які маці, сыходзячы на работу, ставіць пад дзве падушкі, каб не астыў, садзіцца за камп'ютар, за якім і праводзіць увесь астатні дзень. Увечары, гадзін у дзевяць, мы з ёй часта сустракаемся — я вяртаюся з работы, а яна якраз выходзіць са сваёй кватэры: каля пад'езда ўжо чакае кампанія моладзі. Яны будуць «галівудзіць» недзе да ночы, а раніцай бацькі будуць хадзіць на пальчыках і размаўляць шэптам, каб іхняя стомленая прынцэса выспалася. Увечары маці, прыйшоўшы з работы, перамые гару нямытага посуду, які «прынцэса» назбірала за дзень, будзе варыць на заўтра абед, пыласосіць кватэру. Бацька пасля работы згайсае на лецішча, прывязе «прынцэсе» сумкі вітамінаў. Яны, наіўныя, шчыра вераць, што калісьці іх Анюта, вывучыўшыся іх стараннямі і зрабіўшы ашаламляльную кар'еру, забяспечыць ім бесклапотную сытую старасць...

І мая маладзенькая суседка — зусім не адзінкавы прыклад. Як расказала нядаўна яе маці, у ганнінай кампаніі толькі пару чалавек паступілі вучыцца або пайшлі працаваць (напрыклад, падвучыўшыся, касірамі ў супермаркет насупраць — там пастаянна нехта «патрабуецца»). «Ну, гэта тыя, у каго бацькі мала зарабляюць, у іх іншага выйсця няма», — паблажліва разважала суседка. Большасць жа няспраўджаных студэнтаў малітвамі і намаганнямі бацькоў «рыхтуюцца паступаць на наступны год».

Што з гэтага атрымаецца пасля? Канешне, хтосьці сапраўды здзейсніць сваю мару, будзе старанна вучыцца, атрымае жаданую прафесію, добра ўладкуецца ў жыцці на радасць бацькам. Гэта ў ідэале. А больш верагодна будзе так: платнае навучанне (якое ні да чога не абавязвае: цябе не пазбавяць стыпендыі за дрэнныя адзнакі), свабодны дыплом (які дае не толькі шырокія магчымасці працаўладкавання, але і выдатнае тлумачэнне, калі работа раптам «не знаходзіцца»). У выніку — дваццаціпяцігадовае «дзіця» сядзіць дома (шукае работу —«падыходзячы варыянт»), гуляе да раніцы, спіць да абеду, ранкам бацькі ходзяць на пальчыках, а пад дзвюма падушкамі томіцца сняданак (каб не астыў). Нічога новага. Усе ўжо прывыклі, пэўна, так яно і трэба.

Я ведаю аднаго такога «Ілью Мурамца», вельмі неблагога хлопца. Паступіў на платны факультэт, на праграміста. Грошай у бацькоў, каб заплаціць за вучобу, не было, і бацька паехаў на заробкі ў Расію, аж но на Чукотку. Так і ездзіў, пакуль сын вучыўся. Ездзіць і дагэтуль, хоць нашчадак тры гады як закончыў універсітэт. Бо дыпламаваны праграміст не можа знайсці работу: там не яго профіль, там — патрэбен стаж работы, там — мала плацяць, там — не так на яго паглядзелі. А навошта хвалявацца і напружвацца: дах над галавой ёсць, паесці клапатлівая маці наварыць. Спатрэбіліся новыя джынсы — зляпіць каму праграму на заказ — купіць (галава ж варыць нядрэнна). Тры з паловай тысячы сярэдняя зарплата ў сферы IT? Ён па-за гэтай статыстыкай. Яму столькі не трэба. А падатак на ўтрыманства заплаціць бацька, прыехаўшы з чарговай камандзіроўкі...

Нядаўна з вуснаў кіраўніка дзяржавы прагучала: не зарабляць у краіне можа толькі лянівы. Але праблема ў тым, што сёння бацькоўская апека і неблагі дабрабыт нярэдка гэтых самых лянівых і культывуюць. І ніякія меры ні на якім узроўні не дапамогуць. Пакуль самі сабе не прызнаемся, што, аберагаючы дзяцей ад фізічнай працы, не цікавячыся не толькі кім яны хочуць быць, а тым — наколькі яны здольныя быць тымі, кім хочуць, мы гадуем тых самых патэнцыяльных гультаёў. Якія не будуць зарабляць ні для краіны, ні нават для саміх сябе. І тут справа не ў наяўнасці або адсутнасці сістэмы прафарыентацыі ў той жа школе. Штосьці незаўважна «перашчоўкнула» ў сістэме выхавання менавіта ў сям'і. Нікога не здзіўляе, што дарослыя дзеткі сядзяць на шыі ў бацькоў «у пошуку сябе», нідзе не працуюць, або праз пень-калоду вучацца на платных аддзяленнях, не робячы ні кроку, ні паўкроку, каб перавесціся на бюджэт, не кажучы ўжо пра тое, каб паспрабаваць зарабіць якую капейчыну, — гэта лічыцца нармальным. І ніяк не караецца нават фінансава — у гэтых дзетак і адзежа, і гаджэты ледзь не апошніх мадэляў — бацькі са скуры гатовыя вылузуцца, каб было не горш чым у людзей. Не разумеючы, што тым самым штурхаюць тых, дзеля каго гатовы і жыццё аддаць, у балота гультайства і бяздзеяння, якое зацягвае нават самых лепшых. Выбраўца з гэтай дрыгвы цяжка, патрэбны сіла волі і мэта, а адкуль і тое, і другое возьмуцца, калі тата з мамай нават не далі пакаштаваць, што гэта такое...

Учора Ганна бацькам заявіла: маўляў, можа, дыпламатыя — гэта не маё. Пайду я лепш у актрысы. Разпланаваны бацька прапанаваў ёй адточваць майстэрства ўжо зараз — паспрабаваць сябе ў ролі дворніка. Скандал у суседзяў быў яшчэ той. Суседка пасля да мяне прыходзіла: цікавілася, можа, яшчэ ў якія каледжы прыём не скончыўся. Здаецца, ужо нідзе набору няма. Позна спахапіліся. Хаця... Можа, сама што ні ёсць своечасова.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ■ Ці чулі?

# Паслухаць пласцінку і...


Фота novgazeta.by.

## У Навагрудку цяпер можна пажыць у нумары, у якім спыняўся Уладзімір Высоцкі

**Легендарны спявак і акцёр наведваў Навагрудчыну ў 1969 годзе, падчас здымак фільма па раманах Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Ён спыняўся ў мясцовым гатэлі ў нумары 320 (цяпер гэта нумар 322). Зусім нядаўна гэтыя пакоі адкрыліся як тэматычныя, прысвечаныя спеваку.**

— Уладзімір Высоцкі — вядомая асоба, таму вырашана было зрабіць у гатэлі яго пакой, — адзначае **дырэктар дома-музея Адама Міцкевіча Мікалай ГАЙБА,** які ўдзельнічаў ва ўрачыстым адкрыцці. — На той час гэта быў адзіны нумар люкс у гатэлі, на два пакоі. Цяпер у спальні размяшчаюцца фотаздымкі з партрэтамі Высоцкага, а ў першым пакоі на сцяне зроблены фотакалаж з яго выявамі ў розных ролях, фрагментамі яго розных вершаў.

У пакоі стаіць ранейшы тэлефонны апарат і прайгравальнік пласцінак. У колішнім выглядзе захаваўся і санвузел — тая самая блакітная, прадаўгаватая плітка ляжыць на падлозе. Усё вытрымана ў стылістыцы 1960-х гадоў.

«Людзі на Навагрудчыне захоўваюць выразкі з газет, прысвечаныя Высоцкаму, яго фотаздымкі з Марынай Уладзі, якая таксама прыязджала на нашу зямлю, — адзначае спадар Мікалай. — Значыць, у іх ёсць сапраўдная цікавасць да гэтага творцы».

Пра вялікую сімпатыю Мікалая Гайбы да творчай асобы акцёра і паэта асабліва сведчыць той факт, што ў 1983 годзе, будучы ў войску, ён уласнаручна на машынцы ў пяці экзэмплярах перадрукаваў кнігу Высоцкага «Нерв». Яна выйшла ў 1982 годзе ў маскоўскім выдавецтве «Современник» і на той час была рэдкасцю. Захоўвае яе ў сваёй калекцыі ён і па сённяшні дзень. Таксама ў спадара Мікалая маецца кніга перакладаў вершаў Высоцкага на беларускую мову, пра якую мала хто ведае.

Нумар Уладзіміра Высоцкага ў навагрудскім гатэлі не будзе проста мемарыяльным. У яго можна засяляцца. І ўжо знайшліся ахвотныя, якія жадаюць спецыяльна прыехаць, каб пажыць у такіх адмысловых пакоях. Пакуль што кошт на гэты нумар застаецца такім жа, як і на аналагічныя нумары.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

*Навагрудскі раён*

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

**Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества**

**Лот №1. Автомобиль Toyota Avensis Verso, регистрационный номер 3094 ЕВ-2, 2011 года выпуска. Первоначальная стоимость – 21 010 рублей 30 копеек.**






**Лот №2. Автомобиль Toyota Land Cruiser 120, регистрационный номер 7771 ВЕ-2, 2008 года выпуска. Первоначальная стоимость – 28 908 рублей 12 копеек.**





| | |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | **ООО «СоМеТ» УНП 391427842** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Орша, ул. Марата, 214** |
| **Информация об обременениях** | **Без обременений** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 1<br>19 сентября 2016 года в 11.00** |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211030, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна,<br>тел. 80216543202, 80296161412.<br>Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна,<br>80216543213, 80336878924 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 11.00 16.09.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества (санатория «Лазурный»), принадлежащего ОАО «Агат-электромеханический завод», расположенного по адресу: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, район д. Ждановичи

**Лот № 1**

1. Главный корпус с инв. № 600/С-120425 (Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей). 2. Внутриплощадочные сети водопровода с инв. № 30001011. 3. Внутриплощадочные сети канализации с инв. № 30002010. 4. Внутриплощадочные сети электроснабжения с инв. № 30003011. 5. Внутриплощадочные тепловые сети с инв. № 30004009. 6. Внутриплощадочные сети связи с инв. № 30006007. 7. Резервуары с инв. № 10301074. 8. Дюкер через «Дроздовское водохранилище» (толстостенная труба D 800, 450 м п.) с инв. № 10301075. 9. Малые архитектурные формы и лестницы с инв. № 10301076. 10. Озеленение внутриплощадочной территории (плодовые деревья) с инв. № 10301077. 11. Благоустройство территории с устройством асфальтобетонных подъездных путей и площадок (камень декоративный) с инв. № 10301078. 12. Светопрозрачное металлическое ограждение (ограждение из профильных труб) с инв. № 20007043. 13. Наружное освещение с установкой 28 фонарей с инв. № 30003012. 14. Беседка деревянная с инв. № 70024271. 15. Беседка деревянная с инв. № 70024272. 16. Цветник природная чаша с инв. № 70024280. 17. Хвойное растение туя с инв. № 70024281. 18. Живая изгородь из бюрючины с инв. № 70024282. 19. Цветник «Альпийская горка» с инв. № 70024283. 20. Многолетнее растение спирия вангутта с инв. № 70024284. 21. Сплит-система POLAIR SM 222s (холодильная камера в столовой) с инв. № 70024303. 22. Стелла-указатель с инв. № 70024304. 23. Игровой комплекс «Верхолаз» с инв. № 20007046.

| **Начальная цена с НДС, бел. руб.:** | **Задаток, бел. руб.:** | **Шаг аукциона:** 5% |
|---|---|---|
| 4 655 292,00 (46 552 920 000)* | 232 764,60 (2 327 646 000)* | |

()* – Цена указана в денежных знаках образца 2000 г. Инвентарные номера ОС указаны согласно данным бухгалтерского учета.

**ЗЕМЕЛЬНЫЕ УЧАСТКИ**

Земельный участок площадью 1,6797 га с кадастровым номером 623681700001000272. Описание права, ограничения (обременения) прав: водоохранная зона. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.
Земельный участок площадью 0,5822 га с кадастровым номером 623681700001000271. Описание права, ограничения (обременения) прав: водоохранные зоны.
Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Два договора аренды для размещения антенн и оборудования систем сотовой связи на неопределенный срок.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 3 (трех) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) перечисляет денежные средства Продавцу в течение 5 (пяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,7% (Ноль целых семь десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Иное имущество, не включенное в состав Объекта, будет вывезено Продавцом в течение 30 дней после заключения договора купли-продажи Объекта.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 27.09.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Агат-электромеханический завод» (санатория «Лазурный») Лот № 1, **проводимом 27 сентября 2016 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **23.09.2016 в 10.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Короляш Виктор Эдуардович, 8 (017) 267-62-92, 8 (029) 199-10-49, 8 (029) 501-86-30.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЧПТУП «Альбус», находящегося по адресу: Витебская область, г. Браслав, пер. Песчаный, д. 8

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС) | Шаг аукциона, % | Задаток, руб. (10% от начальной цены) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение-здание специализированое для производства текстильных, швейных и кожаных изделий (швейный цех) площадью 924,44 кв.м, инв. № 210/С-11122** | 75 362,00 | 5 | 7 536,20 |

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке 0,2281 га, кадастровый номер 220850100002000002.

**Аукцион состоится 07.10.2016 года в 14.00 по адресу: Витебская область, г. Браслав, ул. Садовая, 6/1.**

**Организатор аукциона – управляющий ЧПТУП «Альбус» Бахуревич Е. В. тел.(8-029) 3608384.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1.**Оплатить задаток** на расчетный счет р/с 3012034245019 в ЦБУ №205 филиала №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660 УНП 390506973.

2. **По 03 октября 2016 г. включительно до 16.00 подать заявление** на участие в аукционе и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: 230025, г. Гродно-25, а/я 13.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

- индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

- иностранным юридическим лицам, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией;

- представителю иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданные обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией без нотариального засвидетельствования;

- представителю гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь , в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона, **обязано:** подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 10 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

**Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8029-360-8384.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО» С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НА 20 ПРОЦЕНТОВ

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб., коп. | Задаток 20%, руб., коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Лот № 1** капитальные строения: | | | |
| 1.1 | *Склад материалов* с инвентарным номером 110/С-86173, площадью 1018,0 кв.м, назначение – здание специализированное складов, хранилищ | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 11Б, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **146 898,05** | **29 379,61** |
| 1.2 | *Склад разнородных материалов* с инвентарным номером 110/С-86155, площадью 1978,0 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 11В/1, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **256 645,25** | **51 329,05** |
| 1.3 | *Здание склада кислородных баллонов* с инвентарным номером 110/С-102689, площадью 98,7 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 11Б/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **11 787,55** | **2 357,51** |
| 1.4 | *Арочный склад* с инвентарным номером 110/С-86200, площадью 823,0 кв.м, назначение – здание специализированное складов, хранилищ | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 11В, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **105 726,72** | **21 145,34** |
| 1.5 | *Здание склада электротоваров и прочего* с инвентарным номером 110/С-102691, площадью 479,1 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 11Б/2, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **74 898,14** | **14 979,63** |
| 1.6 | *Здание проходной центрального склада* с инвентарным номером 110/С-102690, площадью 101,6 кв.м, назначение – здание административно-хозяйственное | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная,11Б/1, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **31 435,68** | **6 287,14** |
| 1.7 | *Благоустройство складов ОМТС* с инвентарным номером 110/С-111838, площадью 14179,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **553 883,81** | **110 776,76** |
| 1.8 | *Забор №7* с инвентарным номером 110/С-111826, площадью 392,8 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **9 537,22** | **1 907,44** |
| 1.9 | *Опора уличного освещения с кабельной линией КЛ 0,4 кВ от ЯК склада материалов и станцией управления* с инвентарным номером 110/С-111888, назначение – сооружение специализированное энергетики | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **3 000,86** | **600,17** |
| 1.10 | *Трубопровод сетевой воды от ТК-3Б до центрального склада* с инвентарным номером 110/С-111714, протяженностью 347,5 м, назначение – сооружение специализированное энергетики | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **6 669,79** | **1 333,96** |
| 1.11 | *Участок канализационной сети склада разнородных материалов до КК-113* с инвентарным номером 110/С-111719, протяженностью 21,8 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **129,98** | **26,00** |
| 1.12 | *Участок канализационной сети от здания проходной центрального склада до КК-108* с инвентарным номером 110/С-111718, протяженностью 55,8 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **333,02** | **66,60** |
| 1.13 | *Трубопровод безнапорный ливневой канализации от КЛ-29 до КЛ-27* с инвентарным номером 110/С-111646, протяженностью 111,9 м, назначение –сооружение специализированное коммунального хозяйства | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **405,50** | **81,10** |
| 1.14 | *Трубопровод артезианской воды от кольца низкого давления от ВК-22 до проходной склада* с инвентарным номером 110/С-111726, протяженностью 49,8 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **135,46** | **27,09** |
| 1.15 | *Трубопровод пожаротушения от ВК-22В к складу разнородных материалов* с инвентарным номером 110/С-111842, протяженностью 99,0 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002697 площадью 2,0622 га | **319,01** | **63,80** |
